

Фота з партала nlb.by

# Сімвал велічы і годнасці нашых продкаў і культуры




З сёлетняга верасня мы маем новы беларускі Буквар. Такім чынам, афіцыйна заканчваецца вялікая і яркая эпоха Буквара Анатоля Клышкі (ён выкарыстоўваўся з 1969 да 2021 г. – больш як паўстагоддзя) і пачынаецца новая эпоха. Новы падручнік мае ярка выражаны нацыянальны кантэнт. У яго ўключаны заданні і практыкаванні, што адлюстроўваюць каштоўнасці культуры беларускага народа. А для лепшага ўспрымання першакласнікі з дапамогай QR-кодаў атрымаюць доступ да дадатковага медыякантэнту: серыі мультфільмаў кінастудыі «Беларусьфільм» пра літары алфавіта.

3 верасня ў межах святкавання Дня беларускага пісьменства ў Нацыянальнай бібліятэцы адбылася прэс-канферэнцыя і прэзентацыя, прысвечаная выхаду новага навучальнага выдання для 1 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання.

Над распрацоўкай і выданнем буквара працавала шмат людзей. Аўтарскі калектыў быў адабраны паводле вынікаў конкурсу Нацыянальнага інстытута адукацыі (НІА). Яго супрацоўнікі і рэцэнзенты арганізавалі і правялі экспертызу дапаможніка, а работнікі выдавецкага цэнтра НІА падрыхтавалі дапаможнік да выдання.

Дырэктар НІА Валянціна Гінчук зазначыла: «На старонках вучэбнага выдання акумуляваная метадычная думка не аднаго пакалення вучоных. Буквар быў створаны намаганнямі вялікай колькасці людзей. У ім рэалізаваныя сучасныя метадычныя падыходы да навучання чытанню, аўтарскія знаходкі і ўвасоблены практычны педагагічны вопыт». Намеснік генеральнага дырэктара НББ Аляксандр Суша адзначыў, што выпуск вучэбнага дапаможніка – унікальная падзея, з якой пачынаецца новая, вельмі цікавая і надзвычай разнастайная, эпоха ў гісторыі беларускага буквара: «Беларусы зрабілі вельмі шмат, каб буквар стаў сусветнай з'явай, бо самыя тыражныя і папулярныя выданні ствараліся беларусамі ў розныя стагоддзі. Цяпер буквар – адзін з брэндаў Беларусі, сімвал велічы і годнасці нашых продкаў, нас і нашай культуры».



Фота з партала nlb.by

Генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір Карачэўскі і стваральнікі мультфільмаў Ірына Тарасава і Канстанцін Андрушачкін распавялі пра іх карпатлівую шасцігадовую гісторыю стварэння і прадставілі адну з серый.

Дэкан факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Наталля Ждановіч пад час мерапрыемства сказала: «Мы назіраем нараджэнне новага буквара. Ён дасць першакласнікам навык, які дазволіць вучыцца, знаходзіць новыя веды і дасягаць новыя вяршыні». Намеснік дырэктара гімназіі № 23 г. Мінска Галіна Полудзень распавяла аб распрацаваным кантэнце для Адзінага інфармацыйна-адукацыйнага рэсурсу Беларусі, што ажыццёўлена намаганнямі настаўнікаў навучальнай установы і аўтараў буквара ў адпаведнасці са зместам новага дапаможніка.

Вядома ж, выступілі і аўтары падручніка – дацэнт кафедры беларускага і рускага моваязнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Вольга Свірыдзенка і вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Вольга Цірынава.

У час мерапрыемства госці таксама пазнаёміліся са спецыяльна падрыхтаванай выставай-праглядам 30-і нацыянальных букваронў і выданняў для пачатковага навучання чытанню і грамаце з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі.

***Паводле паведамлення аддзела сувязяў з грамадскасцю НББ***